При улучшении качественных показателей одновременно повышается индекс конкурентоспособности – это мы проследили при сравнении с товарами конкурентов.

***І. В. Грабянчук***
Рэспубліка Беларусь, Бабруйск

# НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЯ ПРАЦА СТУДЭНТАЎ БАБРУЙСКАГА НАСТАЎНІЦКАГА ІНСТЫТУТА

У вышэйшых навучальных установах навукова-даследчая праца студэнтаў праводзіцца ў мэтах рэалізацыі іх творчых здольнасцяў і фарміравання прафесійнай кампетэнтнасці. Неабходнасць належнай арганізацыі дзейнасці студэнтаў у гэтым накірунку ўсведамлялася выкладчыкамі Бабруйскага настаўніцкага інстытута (БНІ) з першых дзён яго існавання. 21 верасня 1949 г. на першай нарадзе прафесарска-выкладчыцкага саставу БНІ (яшчэ да стварэння яго Рады), было ўзнята пытанне аб арганізацыі студэнцкіх гурткоў, адзначалася неабходнасць лепш ведаць студэнтаў, разумець іх патрэбы.

Змест архіўных крыніц [1] сведчыць пра тое, што асноўнай формай навукова-даследчай працы студэнтаў Бабруйскага настаўніцкага інстытута былі заняткі ў тэматычных гуртках. У гэтай ВНУ дзейнічалі фізічны гурток пры кафедры фізікі і матэматыкі і два гурткі пры кафедры рускай і беларускай моў – мовазнаўчы і дыялекталагічны.

Інфармацыя аб працы фізічнага гуртка ў архіўных крыніцах не захавалася. На нашу думку, гэта звязана з праблемамі арганізацыі навукова-даследчай працы выкладчыкаў кафедры фізікі і матэматыкі. Пра тое, што яна практычна адсутнічала ў гэтым структурным падраздзяленні інстытута прама казалася ў афіцыйных дакументах. Зразумела, што ў такіх умовах нельга было эфектыўна арганізаваць адпаведную дзейнасць студэнтаў.

Мовазнаўчым гуртком пры кафедры рускай і беларускай моў кіраваў старшы выкладчык Крапівін Пётр Фёдаравіч. У гуртку вывучаліся пытанні па гісторыі рускай мовы, якія не ўваходзілі ў вучэбную праграму («Мова старажытнарускіх песень», «Вывучэнне розных поглядаў на паходжанне рускай мовы», «Выказванні аб рускай мове» і інш.). Адзначым, што


БДЭУ. Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт. Бібліятэка.
БГЭУ. Белорусский государственный экономический университет. Библиотека.°.
BSEU. Belarus State Economic University. Library.
http://www.bseu.by elib@bseu.by

адміністрацыя інстытута была незадаволена «ідэйнай недысцыплінаванасцю» Крапівіна: «Патрэбна сказаць, што кіраўнік гуртка тав. П. Ф. Крапівін сам памыляўся у антымарксісцкім вучэнні акадэміка Мара і ўводзіў у зман сябраў гуртка. Значная доля пытанняў, навязаная тав. Крапівіным усім сябрам гуртка насуперак указанням кафедры, прыпадае на вывучэнне твораў акадэміка Мара без іх крытычнай ацэнкі» [1, спр. 2, арк. 30].

Мікалай Якаўлевіч Мар (1865–1934) – расійскі і савецкі ўсходазнавец, філолаг, гісторык, этнограф і археолаг, акадэмік Імператарскай акадэміі навук (1912), а пасля акадэмік і віцэ-прэзідэнт АН СССР (у тым ліку акадэмік АН БССР з 1928 г.). Ён распрацаваў «новае вучэнне аб мове», якое было вельмі супярэчлівым і па многіх пазіцыях недастакова абгрунтаваным. Тым не менш тэорыя Мара ў канцы 1920-х гг. атрымала афіцыйную падтрымку і да выхаду ў 1950 г. работы І. Сталіна «Марксізм і пытанні мовазнаўства» прапагандавалася як «сапраўднае марксісцкае» мовазнаўства, а яе крытыкі падвяргаліся ідэалагічнаму ціску і нават рэпрэсіям. Аднак пасля выхаду ўзгаданай работы Сталіна сітуацыя змянілася: цяпер ужо акадэмік Мар і яго прыхільнікі былі падвергнуты афіцыйнай крытыцы за «ідэалізм» у мовазнаўстве.

Па іроніі лёсу П. Крапівін якраз незадоўга да гэтай перамены апублікаваў у абласной газеце «Савецкая Радзіма» артыкул, у якім высока ацаніў творчую спадчыну М. Я. Мара. Разгарэўся вялікі скандал, які меў негатыўны ўплыў і на навукова-даследчую дзейнасць студэнтаў Бабруйскага настаўніцкага інстытута.

У гэтым інстытуце найбольш плённай была дзейнасць дыялекталагічнага гуртка пры кафедры рускай і беларускай моў. Спачатку ім кіравала старшы выкладчык Горбач Хрысціна Дзмітрыеўна, а з верасня 1950 г. і да закрыцця інстытута ў 1954 г. – старшы выкладчык Касцян Мікалай Ігнацьевіч. У гэтым гуртку бабруйскія студэнты збіралі матэрыялы для дыялекталагічнага атласа Беларусі, выданне якога рыхтавала Акадэмія навук БССР.

Пра дыялекталагічны гурток двойчы ўзгадвала абласная газета «Савецкая Радзіма». Яго кіраўнік М. І. Касцян адзначаў, што складанне дыялекталагічнага атласа БССР «...дасць магчы-

масць глыбока даследаваць працэсы ўзаемаўплыву і суадносін тэрытарыяльных дыялектаў, ступень уплыву літаратурнай мовы на жывыя гаворкі, прасачыць за тымі змяненнямі, якія адбыліся ў гаворцы пэўнага раёна за гады Савецкай улады». Далей Касцян казаў аб вялікім значэнні будучага атласа для працы гісторыкаў, этнографаў, літаратуразнаўцаў, археолагаў, фалькларыстаў. У выніку запісы народных гаворак сталі справай не толькі спецыялістаў-дыялектолагаў, але і шырокай грамадскасці [2].

На працягу 1949–1954 гг. пастаянна ў гуртку займаліся каля 25 студэнтаў. Каардынавалі іх працу супрацоўнікі Акадэміі навук БССР. Студэнты ўдзельнічалі ў экспедыцыях па вывучэнні беларускіх гаворак жыхароў населеных пунктаў Бабруйскага, Кіраўскага, Клічаўскага, Любаньскага, Парыцкага раёнаў. Яны сабралі багаты матэрыял не толькі па дыялекталогіі, але і па этнаграфіі, высветлілі і запісалі гісторыю ўзнікнення некаторых вёсак [1, спр. 2, арк. 30, 50; спр. 10, арк. 48; спр. 19, арк. 90; спр. 32, арк. 126].

Частка матэрыялаў, звязаных з дзейнасцю дыялекталагічнага гуртка пры кафедры рускай і беларускай моў БНІ, захоўваецца ў Бабруйскім дзяржаўным занальным архіве [3]. У матэрыялах гэтай справы ёсць падрабязныя метадычныя ўказанні да праграмы па вывучэнні беларускіх народных гаворак, распрацаваныя Інстытутам мовы, літаратуры і мастацтва Акадэміі навук БССР, планы працы гуртка, крытычныя агляды сабраных студэнтамі ў эспедыцыях матэрыялаў, перапіска ўзгаданага акадэмічнага інстытута з Бабруйскім настаўніцкім інстытутам (у тым ліку ліст ад 4 верасня 1952 г. за подпісам знакамітага беларускага паэта і навукоўца Пятра Глебкі [3, арк. 30]).

Кіраўніцтва Бабруйскага настаўніцкага інстытута надавала асаблівую ўвагу працы дыялекталагічнага гуртка, імкнулася далучыць да яе студэнтаў усіх аддзяленняў. У той жа час імкненне да масавасці прыводзіла да таго, што ў гуртку далёка не ўсе студэнты былі належным чынам падрыхтаваны для навукова-даследчай працы. У некаторых выпадках яны праводзілі апрацоўку сабранай інфармацыі з шматлікімі памылкамі, а часам і проста хітравалі, выдаючы спісаны матэрыял з метадычных дапаможнікаў за сабраны ў палявой экспедыцыі.

Тым не менш, нягледзячы на ўсе праблемы метадалагічнага і арганізацыйнага характару, студэнты Бабруйскага настаўніцкага інстытута зрабілі свой унёсак у справу складання дыялекталагічнага атласа Беларусі. Кіраўнік гуртка М. І. Касцян у сваёй справаздачы аб выкананай працы за 1953 – 1954 гг. адзначаў, што сектар дыялекталогіі Інстытута мовазнаўства АН БССР прызнаў сабраныя матэрыялы бабруйскімі студэнтамі па 14 населеных пунктах прыгоднымі для картаграфавання. Сам жа «Дыялекталагічны атлас Беларускай ССР» выйшаў з друку ў 1963 г., толькі праз 9 гадоў пасля закрыцця БНІ.

Такім чынам, у Бабруйскім настаўніцкім інстытуце былі дасягнуты пэўныя поспехі ў навукова-даследчай працы студэнтаў, хоць у цэлым яна так і не была арганізавана на належным узроўні. Звычайна перад новым навучальным годам на пасяджэнні Рады БНІ прымалася рашэнне «умацаваць кіраванне навуковымі гурткамі студэнтаў лепшымі выкладчыкамі кафедраў». Адначасова гаварылася пра неабходнасць «карэнным чынам» палепшыць навукова-даследчую працу саміх выкладчыкаў. На жаль, такога паляпшэння не адбылося. Аб агульным стане навукова-даследчай працы студэнтаў можна меркаваць па наступнаму пункту пастановы Рады БНІ аб задачах на 1953/54 навучальны год у яе першапачатковай рэдакцыі: «...15. Ажывіць працу студэнцкіх гурткоў» [1, спр. 47, арк. 22]. Аднак у зацверджаным тэксце проста сказана аб далейшым паляпшэнні гэтай працы [1, спр. 47, арк. 10].

## Спіс выкарастаных крыніц


1. Гадавыя справаздачы Бабруйскага настаўніцкага інстытута // Бабруйскі занальны дзяржаўны архіў (далей – БЗДА). – Ф. 1170. – Воп. 1. – Спр. 2, 10, 19, 32, 48, 57; Пратаколы паседжанняў Рады Бабруйскага настаўніцкага інстытута // БЗДА. – Ф. 1170. – Воп. 1. – Спр. 3, 20, 33, 47.

2. У Бабруйскім настаўніцкім інстытуце [Навуковы гурток па вывучэнню мясцовага говару] // Савецкая Радзіма. – 1951. – 29 красавіка. – С. 3; *Касцян, Н.* Запісы народных гаворак / Н. Касцян // Савецкая Радзіма. – 1952. – 28 чэрвеня. – С. 3.

3. Матэрыялы дыялекталагічнага гуртка за 1951–1954 // БЗДА. – Ф. 1170. – Воп. 1. – Спр. 27.



БДЭУ. Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт. Бібліятэка.
БГЭУ. Белорусский государственный экономический университет. Библиотека.°.
BSEU. Belarus State Economic University. Library.
http://www.bseu.by elib@bseu.by